ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

MCMXL

№ 8 (405)
25 кастрычніка 2011 года

Выдаецца з 1986 года. Выходзіць адзін раз на месяц. Распаўсюджваецца бясплатна

# Нам з мамінай любоўю ўтульна ўсё жыццё

**Рэспубліка Беларусь адзначыла Дзень маці. Гэтае свята ў нашай краіне з'яўляецца днём глыбокай павагі і пакланення перад жанчынай-маці, днём умацавання сям'і. Гэты дзень дапамагае нам больш моцна адчуць веліч і святасць найважнейшай місіі жанчыны, звязанай з нараджэннем і выхаваннем дзяцей, усвядоміць яе велізарную ролю ў захаванні і ўмацаванні духоўных каштоўнасцяў, перш за ўсё – сямейных. Бо толькі ў шчаслівай сям'і вырастуць мудрыя і добрыя людзі, дзякуючы якім сусвет стане лепшым і бяспечным.**



Дацэнт, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі ГрДУ імя Янкі Купалы Сняжана Здзіславаўна СЕМЯРНІК выхоўвае разам з мужам траіх цудоўных дзетак: старэйшаму сыну Мацвею 10 гадоў, ён іграе ў тэніс, любіць музыку і гітару; 8-гадовая дачушка Вераніка займаецца танцамі і іграе на фартэпіяна; даволі паспяховым рыбаком лічыцца ў сям'і першакласнік Арсеній. Шчаслівая маці лічыць: "Мацярынства – гэта і абавязкі, і клопаты. Дзецям вельмі неабходна нашае цяпло. Яно для іх даражэйшае за ўсе падарункі. Якім бы напружаным ні быў наш графік, у ім абавязкова павінен быць час для зносінаў з сям'ёй. Мацярынства – гэта і вялікае шчасце, і стымул. Стымул для новых дасягненняў. Бо толькі грамадства, якое складаюць моцныя і дружныя сем'і, можа з упэўненасцю глядзець у заўтрашні дзень".

Яшчэ адным сведчаннем павагі да жанчыны-маці стала Алея маці каля будынка Гродзенскага перынатальнага цэнтра, якую разам з шматдзетнымі маці пасадзілі прадстаўнікі нашай ВНУ.

**Уласн. інф.**

**НА ЗДЫМКАХ: С.З. Семярнік з дзецьмі; закладка Алеі маці. Фота Юрыя ІВАНЮКА.**



ПРИГЛАШАЕМ

## Выставка-ярмарка «Образование и карьера-2012. ГрГУ имени Янки Купалы»

ГрГУ имени Янки Купалы приглашает будущих абитуриентов, их родителей и педагогов, всех, кто мечтает о получении качественного образования, всерьез думает о собственной карьере, посетить 20 ноября 2011 года выставку-ярмарку «Образование и карьера-2012. ГрГУ имени Янки Купалы».

Выставка-ярмарка будет работать в главном корпусе ГрГУ имени Янки Купалы (ул. Ожешко, 22). В мероприятии примут участие факультеты, колледжи, Институт повышения квалификации и переподготовки кадров, региональный центр тестирования и профессиональной ориентации молодежи; Республиканский институт контроля знаний. На выставке-ярмарке все желающие смогут получить информацию о правилах приема в учреждения высшего, среднего специального образования, о порядке поступления на дневную и заочную формы получения образования, переподготовки, второго высшего образования.

В ходе работы выставки-ярмарки пройдут презентации, семинары, мастер-классы и другие мероприятия.

27 ноября 2011 г. выставка-ярмарка будет работать в Лидском колледже ГрГУ имени Янки Купалы.

**Соб. инф.**

СОТРУДНИЧЕСТВО

## Перспектывы сумесных праектаў

Падчас знаходжання рэктара ГрДУ Я.А. Роўбы ў складзе дэлегацыі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь у Літве падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве і абмеркаваны праект палажэння аб стварэнні Беларуска-Літоўскага навукова-тэхнічнага цэнтра супрацоўніцтва на базе Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

Дэлегацыя Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь пабывала ў Літоўскай Рэспубліцы і правяла шэраг перамоў у буйных навуковых і інавацыйных цэнтрах.

Дэлегацыя наведала Літоўскі сельскагаспадарчы ўніверсітэт, сустрэлася з кіраўніцтвам ВНУ і аддзялення сельскай і лясной гаспадаркі Акадэміі навук Літвы. Удзельнікі дэлегацыі азнаёміліся з напрамкамі навуковых даследаванняў і перспектывамі развіцця сумесных навуковых і тэхналагічных праектаў з беларускім бокам. Беларуская дэлегацыя пабывала таксама ў Міжнародным цэнтры гарманізацыі чалавека і Міжнародным цэнтры гарманізацыі грамадства кампаніі «SENUKAI». Адбыўся шэраг сустрэч з прадстаўнікамі літоўскага бізнэсу і прамысловасці. Прайшлі перамовы ў канцэрне «Achema group», UAB «Metoil», кампаніі па вытворчасці лазернай тэхнікі «EKSPLA» ад Інстытута фізікі Акадэміі навук Літвы, а таксама ў Міністэрстве асветы і навукі Літоўскай Рэспублікі. Былі падпісаны пратаколы аб намерах паміж ДКНТ і ЛСГУ.

**Уласн. інф.**

## Здесь будет вершиться правосудие!

**Стать участником судебного процесса в роли судьи, прокурора или адвоката могут студенты юридического факультета ГрГУ имени Янки Купалы. Происходит это в зале судебных заседаний, который открыт в учебном корпусе юрфака. Здесь же проходят и выездные заседания судов, на которых также присутствуют студенты.**



Один раз поучаствовать – намного лучше, чем много раз теоретически представлять процесс. Хоть и до этого нам приходилось бывать в судах, но здесь занятия проходят так, что мы не только видим, но и задаем вопросы, обсуждаем, спорим. И надо сказать, что это действительно действенный способ не только практической подготовки, но и профилактической работы. Заседания могут транслироваться в режиме реального времени в любую аудиторию, многократно увеличивая число присутствующих.

На торжественном открытии зала судебных заседаний присутствовали прокурор Гродненской области Виктор Николаевич Морозов; председатель Хозяйственного Суда Гродненской области Валерий Евгеньевич Костюкевич; заместитель председателя Гродненского областного суда, председатель коллегии по уголовным делам Александр Анатольевич Корзун; первый проректор Гродненского государственного университета имени Янки Купалы Светлана Владимировна Агиевец; декан юридического факультета Николай Владимирович Сильченко.

Декан юридического факультета профессор Н.В. Сильченко поблагодарил представителей правоохранительных органов за помощь в создании зала судебных заседаний.

– Здесь будут проходить реальные хозяйственные, уголовные, гражданские процессы, – сказал Николай Владимирович. – Но не менее важно, чтобы студенты, получив из архива дела, изучали и разыгрывали их в качестве модели. Это составляющая того процесса, который мы называем практико-ориентированной подготовкой.

**Юлия ПРОКОПИК, студентка юридического факультета.**

**НА ФОТО: открытие зала судебных заседаний. Фото Юрия ИВАНЮКА.**

ПЕРСОНА

# Універсітэт: асобавы, грамадзянскі і дзяржаўны кантэкст



**Ганароваму прафесару ГрДУ імя Янкі Купалы Сяргею Аляксандравічу ГАБРУСЕВІЧУ споўнілася 75 гадоў. Жыццё і дзейнасць Сяргея Аляксандравіча непарыўна звязаны з нашым універсітэтам: у 1965 г. ён скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гродзенскага педінстытута, працаваў прарэктарам па навуковай рабоце, прарэктарам па вучэбнай рабоце, загадчыкам кафедры. Зараз С.А. Габрусевіч – прафесар кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму. Яго погляды вылучаюцца глыбінёй філасофскага мыслення, шырокім кругаглядам у галіне нацыянальнай і сусветнай культуры, пранізліва-паэтычным успрыняццем жыцця і рэчаіснасці.**

**Універсітэцкая супольнасць ведае Сяргея Аляксандравіча як таленавітага вучонага, аўтарытэтнага педагога і даследчыка, чалавека, які шчодра аддае свой арганізатарскі талент, жыццёвую мудрасць і прафесійны вопыт развіццю ўніверсітэцкай адукацыі. Сяргей Аляксандравіч – аўтар больш за 100 навуковых прац.**

**Сваімі разважаннямі наконт каштоўнасцяў універсітэта, задач, якія выконвае сёння вышэйшая навучальная ўстанова, прафесар Габрусевіч падзяліўся з першакурснікамі ГрДУ імя Янкі Купалы на пашыраным урачыстым пасяджэнні Савета ўніверсітэта. Гэтыя думкі і меркаванні, упэўнены, зацікавяць універсітэцкую супольнасць.**

Малады чалавек, які ўпершыню пераступае парог універсітэта ў якасці студэнта, непазбежна, як непазбежныя восенню грыбныя дажджы, сутыкаецца з трыма важнымі пытаннямі: што ёсць універсітэт; што можа даць універсітэт асабіста мне; што запатрабуе ўніверсітэт асабіста ад мяне?

**Універсітэт – феномен антрапалагічны**, нашталт вынаходніцтва кола. Доказам гэтага ёсць той факт, што амаль усе цывілізацыі імкнуліся стварыць універсітэт. Можна ўзгадаць Акадэмію Платона (Старажытная Грэцыя, IV ст. да н.э.), абсерваторыі, якія былі пашыраныя ў краінах ісламскага свету ў IX–XI ст. н. э., і інш.

Аднак універсітэт – прадукт еўрапейскай культуры. Толькі еўрапейская цывілізацыя здолела стварыць рацыянальную і сістэматычную навуковую дзейнасць, якая і з'явілася падмуркам універсітэта. Адбылося гэта ў XII ст., у 1158 годзе, калі імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі Фрыдрых I Барбароса падпісаў спецыяльную грамату, якой надаў універсітэцкія правы і прывілеі Балонскай школе права. Універсітэт як навуковая, адукацыйная і выхаваўчая ўстанова, як унікальны сацыяльны інстытут аказаўся ў вышэйшай ступені самадастатковым, гуманістычным, запатрабаваным асобай, грамадствам і дзяржавай. І таму вельмі хутка трыўмфаваў у Еўропе. У XIII ст. універсітэты адчыняюцца ў Кембрыджы і Оксфардзе (Англія), Парыжы і Манпелье (Францыя), Саламанцы (Іспанія), Лісабоне (Партугалія), у XIV ст. – у Цэнтральнай Еўропе: Празе (Чэхія), Кракаве (Польшча), Гейдэльбергу (Германія), у XVI ст. – ва Усходняй Еўропе (Вільня, Львоў) і Лацінскай Амерыцы (Санта-Дамінга, Мехіка, Ліма). Першы ўніверсітэт у ЗША заснаваны ў пачатку XIX ст. У другой палове гэтага стагоддзя арганізуюцца ўніверсітэты ў Індыі (Калькута, Мадрас, Бамбей), Японіі (Токіа, Кіёта), Кітаі (Пекін). У пачатку XX ст. заснаваны Каірскі ўніверсітэт – першы на афрыканскім кантыненце.

Універсітэт сёння – самая масавая, самая эфектыўная, самая запатрабаваная інстытуцыя сусветнай інтэлектуальнай культуры. У нашай краіне працуюць 55 вышэйшых навучальных устаноў, 32 з іх маюць статус універсітэта.

**Так што ёсць універсітэт?** Лацінскае слова Universitas, ад якога паходзіць беларускае " ўніверсітэт", мае два сэнсы. Першы – гэта сукупнасць, агульнасць. У гэтым сэнсе ўніверсітэт – вышэйшая навуковая і адукацыйная ўстанова, якая рыхтуе спецыялістаў па сукупнасці дысцыплін, якія складаюць аснову навуковых ведаў пэўнай эпохі. Гэты сэнс быў дакладна рэалізаваны ў структуры сярэднявечнага ўніверсітэта. Ён меў 4 факультэты: права, медыцыны, тэалогіі, філасофіі і даваў веды пра Бога, чалавека, грамадства і прыроду. Сучасныя ўніверсітэты рыхтуюць спецыялістаў па шырокім спектры спецыяльнасцяў і спецыялізацый. У іх складзе – дзясяткі факультэтаў і навуковых структур, сотні кафедраў. Напрыклад, наш універсітэт рыхтуе спецыялістаў па 64 спецыяльнасцях, у яго структуры 16 факультэтаў, 81 кафедра, Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў і шмат іншых навуковых падраздзяленняў.

Другі сэнс лацінскага Universitas мае больш шырокі кантэкст: Universitas magistrorum et scolarium – карпарацыя выкладчыкаў і студэнтаў. Я схіляюся да разумення ўніверсітэта як карпарацыі прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў. Для мяне прафесар і студэнт – калегі, таму што яны робяць адну, вельмі важную для нашага грамадства, для нашай краіны справу.

Універсітэт сёння з'яўляецца важнейшай інстытуцыяй сусветнай культуры, падмуркам інтэлектуальнай культуры чалавецтва. А на чым грунтуецца гістарычная запатрабаванасць універсітэта асобай, грамадствам, дзяржавай? Адказ відавочны – на ўнікальнасці, гуманізме, эфектыўнасці ідэі ўніверсітэта як інстытуцыі.

**Калі прымяніць да аналізу ідэі ўніверсітэта аксіялагічны падыход, то яе сутнасць, яе змест можа быць зведзены да пяці асноўных каштоўнасцяў: свабода, аўтаномія, навука, сувязь з бізнэсам і сувязь з уладай.**

Асаблівая харызма ўніверсітэта сілкуецца за кошт таго, што ўніверсітэт успрымаецца як востраў свабоды. Незалежна ад таго, хто выступае заснавальнікам універсітэта – дзяржава, царква ці муніцыпалітэт – універсітэту гарантуецца свабода інтэлектуальнай дзейнасці і свабода выкладання. У Беларусі гэтыя свабоды гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, універсітэт існуе дзякуючы свабодзе, але і свабода існуе дзякуючы ўніверсітэту. Зразумела, што ўніверсітэцкая свабода патрабуе ад універсантаў вялікай адказнасці – перад сабой, перад грамадствам, перад дзяржавай.

Другая каштоўнасць ідэі ўніверсітэта – аўтаномія. Аўтаномнасць арганічная для ўніверсітэта, паколькі свабода навуковай дзейнасці і выкладання без яе немагчымы.

Трэцяя каштоўнасць ідэі ўніверсітэта – навука. Глыбінная сутнасць універсітэта заключаецца ў тым, каб узвышаць і ўдасканальваць асобу. Для рэалізацыі гэтай задачы існуе адзіны шлях – рэальны ўдзел студэнтаў пад кіраўніцтвам прафесараў і выкладчыкаў у навуковых даследаваннях.

Чацвёртая каштоўнасць – сувязь з бізнэсам. У беларускіх універсітэтах яна, на жаль, развіта слаба, як, дарэчы, і ва ўніверсітэтах іншых краін постсавецкай прасторы. Ва ўмовах пераходу нашай краіны да рыначнай эканомікі неабходна шукаць шляхі супрацоўніцтва з бізнэсам.

Пятая каштоўнасць ідэі ўніверсітэта – выпрацоўка разумных, адказных і ўзаемавыгадных адносін з уладай, у тым ліку з мясцовай. Універсітэцкая аўтаномія не азначае замкнёнасці. Універсітэт – сацыяльны інстытут нацыянальнага маштабу і магутны рэгіёнастваральны фактар.

Задача ўніверсітэта палягае ў тым, каб прапаноўваць уладзе канкрэтныя ўнікальныя ідэі і праекты. Толькі ў гэтым выпадку магчыма рэалізацыя звышзадачы ўніверсітэта – фарміраванне ў студэнтаў самастойнага бачання цывілізацыйных, нацыянальных і рэгіянальных праблем, здольнасці іх вырашаць на практыцы.

**Што можа даць універсітэт вам, мае маладыя сябры?** Усё тое, чаго годны чалавек у самым высакародным сэнсе гэтага слова. У кожнага з нас ёсць родная маці. Кожны з нас пераняў мацярынскую мараль, мацярынскі светапогляд. Гэта і ёсць, без сумнення, наша найвялікшае багацце. Людзі, якія прайшлі навучанне ва ўніверсітэце, стаўяцца да яго як да сваёй другой маці, называюць яго сваёй альма матэр. Лацінскае alma mater літаральна азначае "маці, якая корміць". Родная маці фізічна і духоўна ўскармлівае нас як індывідаў, універсітэт – як інтэлектуальных, духоўных асоб.

Універсітэт дасць вам цікавую творчую спецыяльнасць, выхавае ў вас высокія маральныя якасці і эстэтычны ідэал, адкрые вам высокі сэнс патрыятызму і самаадданага служэння свайму народу і сваёй дзяржаве. Універсітэт дасць вам свабоду – свабоду ад кан'юнктуры, свабоду ад інэрцыі, свабоду ад канфармізму, свабоду ад ціску масавай свядомасці і масавай культуры, свабоду ад любога віду рэкламы.

**А што запатрабуе ад вас універсітэт?** Зусім няшмат. Лацінскае слова "student" ("studentis") у перакладзе на беларускую мову азначае "старанна працуючы" (чалавек), рускі варыянт – "усердно работающий человек". І паколькі вам пашчасціла ўвайсці ва Універсітэт, у гэты велічны Храм свабоды, навукі, адукацыі, дабрыні, святла і прыгажосці, пастарайцеся знайсці фізічныя, інтэлектуальныя і маральныя сілы старанна папрацаваць усе пяць гадоў. Праца гэтая не будзе лёгкай. Бо ўніверсітэт запатрабуе ад вас вызначыць высокую мэту, абраць высокую мару і жыць адпаведна максіме рускага паэта Валерыя Брусава:

*Вперед, мечта, мой верный вол,*
*Неволей – если не охотой,*
*Я близ тебя, мой кнут тяжел.*
*Я сам тружусь, и ты работай.*

Так, праца гэтая не будзе лёгкай. Але як жа шчодра ўзнагародзіць яна вас асабіста, вашых блізкіх, наш народ і нашу дзяржаву.

**Шаноўныя калегі! З сённяшняга дня і да таго ўрачыстага моманту, калі вы атрымаеце дыплом Універсітэта, рэктарат, дэканаты, кафедры, прафесары і выкладчыкі, кіраўнікі навуковых, творчых і грамадскіх структур будуць рабіць усё магчымае для таго, каб вашы мэты рэалізаваліся і мары здзейсніліся. Адкажыце нам узаемнасцю – будзьце нашымі калегамі.**

## ПРИСУЖДЕНИЕ УЧЕНОЙ СТЕПЕНИ

22.06.2011 г. ученая степень кандидата педагогических наук присуждена Ларисе Михайловне ТАРАНТЕЙ, старшему преподавателю кафедры педагогики и психологии детства ГрГУ имени Янки Купалы, выпускнику аспирантуры ГрГУ имени Янки Купалы 2007 года.

Защита диссертации «Педагогические условия формирования доверительных отношений младших школьников к учителю начальных классов» по специальности «13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования» состоялась в совете по защите диссертаций при БГПУ им. М. Танка. Научный руководитель – В.В. Чечет, доктор педагогических наук, профессор, профессор кафедры частных методик Института повышения квалификации и переподготовки кадров БГПУ им. М. Танка.

14.09.2011 г. ученая степень кандидата исторических наук присуждена Иосифу Иосифовичу ДОРНЯКУ, руководителю производственной практики учебного отдела ГрГУ имени Янки Купалы, выпускнику аспирантуры ГрГУ имени Янки Купалы 2008 года.

Защита диссертации «Белорусско-польское экономическое и культурное сотрудничество в 1991–2004 гг.» по специальности «07.00.02 – отечественная история» состоялась в совете по защите диссертаций при Институте истории НАН Беларуси. Научный руководитель – И.П. Крень, кандидат исторических наук, профессор, профессор кафедры истории Беларуси ГрГУ имени Янки Купалы.

12.10.2011 г. ученая степень кандидата физико-математических наук присуждена Евгению Геннадьевичу МИКУЛИЧУ, обучавшемуся в аспирантуре ГрГУ имени Янки Купалы в 2009–2010 гг. Защита диссертации «Точные константы равномерных приближений некоторых элементарных функций и функций Стилтьеса рациональными операторами» по специальности «01.01.01 – вещественный, комплексный и функциональный анализ» состоялась в совете по защите диссертаций при ГрГУ имени Янки Купалы. Научный руководитель – Е.А. Ровба, доктор физико-математических наук, профессор, ректор ГрГУ имени Янки Купалы.

12.10.2011 г. ученая степень кандидата филологических наук присуждена Зое Зигмундовне СИДОРОВИЧ, выпускнику аспирантуры ГрГУ имени Янки Купалы 2006 года.

Защита диссертации «Глагольное слово в аспекте текстообразования в новеллистическом нарративе А.П. Чехова» по специальности «10.02.02 – русский язык» состоялась в совете по защите диссертаций при Белорусском государственном университете. Научный руководитель – С.М. Антонова, кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры русского языка ГрГУ имени Янки Купалы.

КОНКУРСЫ

# Об Учителе молвили слово

**Никто сегодня не сомневается в значимости профессии педагога. Однако общество, решая сложные проблемы бытия, пока еще слабо поддерживает образ учителя, его труд, направленный в будущее. Воспитать чувство благодарности к этой профессии, желание переосмыслить и оценить педагогический труд помогает ежегодный университетский конкурс на лучшее поздравление ко Дню учителя.**

В этом году в конкурсе участвовали студенты, магистранты, преподаватели и выпускники нашего вуза. Поздравления были самые разные: в жанре стихотворения, эссе, размышления, даже веселых частушек. Были использованы разнообразные формы – стенгазеты, плакаты, музыкальные письма, открытки.

Участники конкурса поздравляли учителей начальных классов, педагогов-предметников, классных руководителей, тренеров, преподавателей высшей школы, кураторов, а также будущих педагогов, ветеранов педагогического труда. Особенно трогательно звучали поздравления в адрес матерей-учительниц.

Прочитайте поздравления, составленные участниками конкурса, и вы убедитесь, что День учителя почитаем в студенческой среде, что студенты понимают, что от их профессионализма, кропотливого и каждодневного труда зависит будущее.

«Ваш праздник – самый светлый день, потому что хороший педагог сродни чуду. Ни одна обучающая компьютерная программа, даже самая совершенная, не может заменить ту уникальную человеческую энергетику, которая исходит от педагога», – говорит Анна Капко.

«Вы все – родители для своих учеников, даете им путевку в жизнь», – утверждает Игорь Свистун. А Снежана Касаткина считает, что «День учителя должен стать праздником всех праздников».

«В этот день я прошу Вас расправить плечи, гордо поднять голову и сказать: «Я – Учитель! Я учу! А это величайшее призвание», – считает Анастасия Зверева.

«Человек, выбравший педагогическую профессию, не заботится о материальном благе, главной ценностью он выбирает детство – сокровищницу внутреннего потенциала», – уверена Татьяна Зенько. С ней солидарны Юлия Ситько и Наталья Гасевич: «В учебных заведениях работают те, для кого педагогика – не только профессия, а состояние души».

Много теплых слов было адресовано педагогам высшей школы: «Преподаватель – гордое звание. Он учит нас математике и языку, физике, истории и культурологии, философии и информатике. Он развивает наше внимание, память, воображение, помогает осмыслить массу монографий и учебников, помогает стать профессионалом в своем деле. А главное – преподает всем самую трудную науку – быть человеком», – замечает Анжела Еременович.

«Есть такое слово – подвижник. В нем сочетаются два важных понятия: движение и подвиг. Они и выражают суть труда педагога, человека, который сопровождает нас в годы радостного детства, противоречивого отрочества, неспокойной юности, совершает каждодневный незаметный подвиг – отдает свои знания, вкладывает в каждого частичку своего сердца», – убеждена Наталья Русецкая.

С улыбкой рассуждают о сложности профессии преподавателя Анжелика Авдей и Александра Козячая:

«…Вы же знаете, что мы – «предатели».
Обменяли пару Вашу на пирожок,
Но на то Вы и преподаватели,
Чтоб в учебе совершили мы прыжок.
Все ночи напролет мы «грызем» учебники,
А потом на парах крепко спим.
Хотим признаться: все Вы – волшебники,
Понимаете нас – мы так к знаниям «летим».
Хотя профессия Ваша не сладка. Ох, трудна!
Но мы, Ваши «коварные мучители»,
Влюбились в Вас! И в этот день, всегда
Провозглашаем дружно: «С Днем учителя!»

Дорогого стоят поздравления от имени выпускников университета Владимира и Александры Соколовых: «Уважаемые педагоги всех времен и народов! Низкий Вам поклон от всех Ваших студентов. Верьте в нас – мы стараемся выполнить все Ваши советы по самосовершенствованию. Гордитесь нами – мы стремимся стать профессионалами. Рассчитывайте на нас – мы никогда не откажем Вам в помощи. Ждите наших детей – мы надеемся, что они будут лучше нас. Желаем, чтобы Вы всегда были уважаемы Вашими учениками и государством».

Коллектив кафедры педагогики напутствовал студентов педагогических специальностей: «Будущий коллега! Спешим поздравить Тебя с Твоим профессиональным праздником! Ты принял мудрое решение – освоить именно этот род деятельности. В недалеком будущем Тебе предстоит информировать, развивать, обучать, приобщать, организовывать, исследовать, воспитывать, корректировать, стимулировать, общаться, управлять, конструировать, подавать пример своим ученикам. Мы постараемся Тебя всему этому научить. Желаем Тебе воспитать в себе гражданскую ответственность и гуманизм, интеллигентность, профессиональную работоспособность, потребность в самообразовании. В добрый путь в освоении самой нескучной профессии на Земле!»

По мнению организационного комитета, победителями конкурса стали: в номинации «Самая убедительная пропаганда престижа педагогической профессии» – коллектив кафедры педагогики, в номинации «Самое оригинальное поздравление» – Анастасия Зверева. Самое проникновенное поздравление составила Ольга Ляховская, самое яркое – Анна Кошко, самое радостное – Анжелика Авдей и Александра Козячая, самое выразительное поздравление – Анна Фортальнова, самое поэтичное – Артем Рапецкий, самое сердечное поздравление – Вероника Дринькова.

**Материалы подготовила Татьяна Михайловна ПРУДКО, старший преподаватель кафедры педагогики.**

КОЛЛЕДЖЫ

# Што ні першакурснік – то талент

**Навучэнцы Ваўкавыскага каледжа дэманструюць, што сучасная моладзь – сапраўды "залатая" моладзь, таленавітая, дапытлівая, працавітая, трывалы падмурак новага грамадства.**



Думку пра тое, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім, пацвердзілі навучэнцы, якія паступілі ў гэтым навучальным годзе ў Ваўкавыскі каледж ГрДУ імя Янкі Купалы. Прыемна здзіўляюць мнагалучны свет іх інтарэсаў і іх дасягненні.

Спецыяльнасць-старажыл "Пачатковая адукацыя", дзякуючы якой пра каледж ведаюць ва ўсёй Беларусі, у верасні папоўнілася новай групай цікавых навучэнцаў. На старасту Юрыя Канстанцінава можна раўняцца: сярэдні бал пасведчання аб базавай адукацыі – 9,4, заняў 3-е месца ў рэспубліканскай алімпіядзе па гісторыі, лічыць, што кожны столькі разоў чалавек, колькі моў ведае, марыць стаць сапраўдным настаўнікам. Аліна Мініч – вельмі творчая асоба, займаецца танцамі, спевамі, удзельніца царкоўнага хору. Бажэна Спогар заняла 3-е месца ў рэспубліканскай алімпіядзе па беларускай мове, займаецца танцамі, наведвае тэатральны гурток. Безумоўна, валейбольный зборнай каледжа пашанцавала – у камандзе новы перспектыўны ігрок – Настасся Глебік – "спартсменка, актывістка і проста прыгажуня", неаднаразова ўзнагароджвалася ганаровай граматай "Лепшы ігрок каманды па валейболе". А яшчэ Насця захапляецца спевамі, удзельніца гуртка "Спадчына", у складзе якога выступала на абласным конкурсе "Мягкая цацка".

Навучэнкі спецыяльнасці "Тэхналогія. Выяўленчае мастацтва" і карысную прафесію атрымаюць, і навучацца быць добрымі гаспадынямі. Выбар такой прафесіі Ірынай Кавальчук не выпадковы, яна даўно і мэтанакіравана займаецца вязаннем і вышыўкай. Неаднаразова станавілася пераможцай этапаў рэспубліканскай алімпіяды па працоўным навучанні, мае дыпломы першай і другой ступеняў.

Спецыяльнасць "Замежная мова" заўсёды карысталася папулярнасцю ў абітурыентаў. Вікторыя Малашчыцкая сярод "навабранцаў" мела самы высокі бал (9,5) за курс базавай школы, паступіла ў каледж з амбіцыёзнай мэтай – дасканала вывучыць мову Шэкспіра. У конкурсах па замежнай мове яна ўдзельнічае з пачатковай школы. З'яўляючыся вучаніцай 9-га класа, у алімпіядзе па англійскай мове за 10-ы клас і на другім этапе рэспубліканскай алімпіяды заняла 3-е месца. Любоў да гэтага прадмета дзяўчынцы прывіла настаўніца англійскай мовы Аліна Генадзьеўна Красільнікава – дарэчы, выпускніца Ваўкавыскага каледжа, пераможца раённага конкурсу "Настаўнік года". Юлія Барысенка таксама дасканала валодае англійскай мовай. Сведчанне таму – 1-е і 2-е месцы ў другім этапе рэспубліканскай алімпіяды.

І ў іншых сферах дзейнасці першакурснікі маюць дасягненні: сцены Ваўкавыскага каледжа ўпрыгожваюць сёння работы Юліі Барысенка, якая захапляецца фатаграфаваннем прыроды; Іна Кучарава ўжо займаецца дызайнам адзення і стварае вячэрнія ўборы. Сабіна Чымбар выдатныя веды мовы Гётэ прадэманстравала на рэспубліканскай алімпіядзе, дзе заняла 1-е і 2-е месцы, і ў творчасці вылучылася, стала пераможцай (2-е месца) абласнога конкурсу вершаваных сачыненняў, прымеркаванага да 80-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча. Крэатыўнасці Наталлі Федарчук можна пазайздросціць – валодае выдатнай дыкцыяй, дэкларуе вершы, паспяхова выступае на розных відах конкурсаў. Глядзіце самі: 2-е месца ў конкурсе сачыненняў па прафілактыцы СНІДу, 2-е месца – па ікебане, 3-е месца – у конкурсе малюнкаў і плакатаў "Юны выратавальнік".

Абітурыенты з высокімі баламі за курс базавай школы, з глыбокімі ведамі геаграфіі паступілі ў Ваўкавыскі каледж на спецыяльнасць "Турызм і гасціннасць": Алёна Уроніч мае самы высокі бал у групе за курс базавай школы – 9,2, адзначана дыпломамі ІІ ступені па працоўным навучанні і правазнаўстве на другім этапе рэспубліканскіх алімпіяд; Ала Лапіна – выдатны знаўца геаграфіі, мае дыплом ІІ ступені на другім этапе рэспубліканскай алімпіяды, 2-е і 3-е месцы ў рэспубліканскай завочнай алімпіядзе па гэтым прадмеце, пераможца вiктарыны, прысвечанай 600-годдзю Белавежскай пушчы.

Дзіяна Шульц марыць стаць экскурсаводам. Яе можна назваць Дзіянай – вядомай у старажытнарымскай міфалогіі багіняй, выдатная паляўнічай, майстрам выстралаў. Яна займала прызавыя месцы ў раённых і абласных спаборніцтвах па біятлоне.

Самымі неардынарнымі асобамі ў Ваўкавыскім каледжы можна назваць навучэнцаў спецыяльнасці "Дызайн". Некаторыя з іх прыйшлі ў каледж, каб працягнуць сямейную традыцыю, напрыклад, Анастасія Хацей і Анастасія Штоп. У складзе навучэнцаў – удзельніца Міжнароднага фестывалю "Славянскі базар" у Віцебску Дар'я Мялешка. Захапленне работай з саломкай дапамагло ёй летам 2011 года паўдзельнічаць у фестывалі ў складзе гуртка "Спадчына". Ад прыроды надзеленая вытанчанай паставай і прыцягальнай знешнасцю, Даша вельмі ўпэўнена адчувае сябе на подыуме і на сцэне. Яна сама і распрацоўвае мадэлі адзення, і дэманструе яго, прыдумвае танцавальныя нумары.

Спецыяльнасць "Дашкольная адукацыя" з'явілася ў каледжы толькі ў 2011 годзе, але хутка набыла папулярнасць. Многія сённяшнія першакурснікі прыйшлі ў каледж "дыпламаванымі" абітурыентамі. Ірына Савеня – дыпламантка ІІІ ступені другога этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове; Нікалета Цэйбей – пераможца (3-е месца) абласных спаборніцтваў па скоках у даўжыню з месца; Настасся Ленец атрымала дыплом І ступені на другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па працоўным навучанні. Наталля Бойка заняла ў складзе баскетбольнай каманды 1-е месца на раённых спаборніцтвах.

Вось так выглядае "зорная" карта талентаў Ваўкавыскага каледжа. Сёлетні набор навучэнцаў асэнсоўвае меркаванне пра абыякавасць сучаснай моладзі.

**Н.В. ЛАЗАРЧЫК,
выкладчык
Ваўкавыскага каледжа.**

**НА ЗДЫМКУ: першакурснікі каледжа.**

АУДИТОРИЯ

# Накопить знания и оценки

Одной из стратегических целей Гродненского университета является интеграция в европейское образовательное пространство, наш вуз проводит серьезную планомерную работу по реализации принципов Болонского процесса.

С начала учебного года в ГрГУ по всем дисциплинам специальностей дневной формы обучения внедрена накопительно-рейтинговая система контроля знаний и компетенций студентов – комплекс мероприятий, направленных на интегральную оценку результатов всех видов деятельности студента при изучении определенной дисциплины. Итоговой формой контроля является экзамен.

Введение накопительно-рейтинговой системы позволит повысить качество образовательного процесса благодаря равномерному распределению учебной нагрузки студентов и преподавателей в течение семестра, позволит стимулировать систематическую работу студентов, снизить роль случайных факторов, влияющих на оценку, повысить объективность оценки компетенций студентов.

Успешность обучения студента оценивается в процессе текущего контроля, который осуществляет преподаватель в виде письменных работ, тестов, рефератов, эссе, в форме коллоквиумов, устных фронтальных опросов. Оценки по различным формам текущего контроля влияют на результаты промежуточных аттестаций.

Следует отметить, что итоговая оценка на экзамене выставляется с учетом успешности обучения студента в течение семестра и ответа на вопросы билета. При этом вклад успешности обучения в течение семестра составляет от 40 до 60 процентов в зависимости от особенностей учебной дисциплины.

**Ю.Я. РОМАНОВСКИЙ,
начальник учебно-методического управления.**

ЗНАЙ НАШИХ!

# Романс романтика

**Андрей Григорьев – известная музыкальная личность в Гродно, в республике, а с недавних пор и за пределами страны. В сентябре студент 1 курса факультета искусств и дизайна ГрГУ стал лауреатом I степени Международного конкурса исполнителей молодежной песни «Здравствуй, молодежь». Постоянные репетиции, многочисленные конкурсы и концертные выступления – это не все, чем занимается молодой исполнитель. О своих увлечениях Андрей рассказал корреспонденту газеты.**



Андрей с четырех лет занимается музыкой, учился в образцовой детской эстрадной студии «Фонтон» Мостовского районного Дома культуры. После окончания школы поступил в Гродненский государственный колледж искусств на специальность «Искусство эстрады (пение)». Сегодня Андрей – студент 1 курса факультета искусств и дизайна Гродненского государственного университета.

Участие и победы Андрея Григорьева в областных, республиканских и международных конкурсах и фестивалях – результат большого трудолюбия и постоянного творческого самосовершенствования.

Вокалист является лауреатом Республиканского конкурса «Молодые таланты» (организатор – Белтелерадиокомпания), Республиканского телевизионного проекта «Сузор'е надзей», фестиваля «Славянский базар-2010» День мастеров искусств Беларуси», городских конкурсов «Песня над Нёманом» и «Нёманская хваля» и других.

Андрей считает участие в таких мероприятиях большим плюсом еще и потому, что появляется возможность пообщаться с популярными артистами и получить от них профессиональные советы и пожелания. К примеру, за время своих выступлений молодой исполнитель познакомился с Алексеем Хлестовым, Инной Афанасьевой, Петром Елфимовым.

Одна из значительных побед Андрея Григорьева – в Международном конкурсе исполнителей молодежной песни «Здравствуй, молодежь» в Ростове-на-Дону. Мероприятие было организовано Парламентским Собранием Союза Беларуси и России в рамках VI Фестиваля «Молодежь – за Союзное государство».

В вокальном конкурсе участвовали 15 коллективов и солистов из разных регионов Беларуси и России. Андрей Григорьев исполнил две песни: «Мама» Валерия Дайнеко и «Романс» Владимира Преснякова.

Выступления конкурсантов оценивало жюри во главе с заслуженным артистом России композитором Сергеем Шустицким. Талант гродненского исполнителя профессионалы оценили Дипломом I степени.

Студент считает, что успех его исполнения зависит от моральной и эмоциональной поддержки мамы и родных, любимой девушки. К своим творческим наставникам Андрей Григорьев относит преподавателя эстрадного вокала Гродненского колледжа искусств Светлану Николаевну Обуховскую и преподавателя кафедры дирижирования и вокала ГрГУ имени Янки Купалы Ирину Федоровну Новосадову.

Андрей играет на фортепиано. Кроме музыкальных увлечений, ему нравится заниматься спортом, играть в волейбол и футбол.

Он считает себя романтиком, любит лирическую музыку. Пытался сам писать слова и музыку для песен. Считает, что ему следует делать еще больший упор на творчество, чтобы добиться значительных успехов в жизни.

В ближайших планах – профессионально заняться аранжировками. Андрей мечтает написать хорошую песню и, чтобы раскрутиться, выпустить ее ротацию на радио, а также найти продюсера, который помог бы ему попасть в большой мир шоу-бизнеса. А пока он уделяет большое внимание учебе, так как считает получение высшего образования одним из важных факторов профессионального и творческого развития.

**Ирина ВЕЧЕРКО.**

**НА ФОТО: студент 1 курса факультета искусств и дизайна А. Григорьев.**

**Фото Юрия ИВАНЮКА.**

ПОЛЕЗНЫЕ СОВЕТЫ ОТ МЧС

# Пожар! Что делать?

С начала нынешнего года в Гродненской области произошло 782 пожара. Погибли 85 человек, в том числе 5 детей. Материальный ущерб составил более 4 млрд. рублей. Что делать, если случился пожар? Сообщить о пожаре в службу спасения по телефону **101.** Сообщить улицу, номер дома, этаж, где произошел пожар, есть ли в помещении люди, кто звонит и номер своего телефона. Вывести детей и пожилых людей из опасной зоны. Оповестить соседей о пожаре и принять меры по ликвидации огня с помощью огнетушителей, покрывал, воды, одеял.

**Помните:**

- При сильном задымлении необходимо наклониться или лечь на пол, закрыв нос и рот мокрым носовым платком или полотенцем, двигаться на четвереньках или ползком к выходу вдоль стены.
- Не открывать окна и двери, так как приток свежего воздуха поддерживает горение.
- Если коридоры и лестничные клетки задымлены, а покинуть помещение не представляется возможным, нужно оставаться в комнате, дверные щели и вентиляционные отверстия закрыть мокрым полотенцем или тканью.
- Не тушить водой электроприборы, включенные в сеть.

# Разбили термометр? Что делать?

Одного разбитого градусника достаточно, чтобы получить тяжелое отравление. Если вы разбили термометр, действуйте следующим образом:

- наденьте перчатки;
- оградите место, где разбился градусник;
- соберите ртуть и все осколки градусника в стеклянную банку с холодной водой, плотно закупорьте ее;
- мелкие шарики можно собрать при помощи шприца, резиновой груши, двух листов бумаги, лейкопластыря, скотча или мокрой газеты;
- откройте окна и тщательно проветрите помещение;
- место «аварии» промойте концентрированным раствором марганцовки или хлорной извести;
- банку с собранным «жидким металлом» отнесите в ближайшее подразделение МЧС.

**Центр пропаганды и обучения при Гродненском областном управлении МЧС.**

СПОРТ

# Дуатлон принес медаль

**10 медалей завоевали курсанты военного факультета ГрГУ имени Янки Купалы на спартакиаде дружеских армий стран СНГ, которая проходила в Санкт-Петербурге на базе Военного института физической культуры. В составе сборной Беларуси было семь представителей Гродненского государственного университета имени Янки Купалы.**



В спартакиаде приняли участие представители Беларуси, Украины, Армении, Казахстана и России. Более 200 спортсменов участвовали в семи видах соревнований – армейском рукопашном бое, стрельбе из штатного оружия, волейболе, гиревом спорте, многоборье, дуатлоне, спортивном ориентировании.

В общекомандном зачете сборная Беларуси заняла второе место, завоевав 26 медалей.

Успешно выступили курсанты военного факультета ГрГУ в отдельных видах программы. В соревнованиях по рукопашному бою курсанты Вадим Тимохов (4 курс) и Евгений Балюк (5 курс) заняли второе место, второкурсник Алексей Баклага – третье. Команда Беларуси заняла второе командное место в этом виде соревнований.

Максим Гребенчук (4 курс) занял второе место в личном зачете в дуатлоне. Команда Беларуси была первой в этом виде соревнований, состоящем из двух этапов – плавание с препятствиями и бег с преодолением полосы препятствий. Максим также занял третье место в преодолении полосы препятствий.

Пятикурсник Иван Крупенич завоевал серебряную награду в гиревом спорте, уступив лишь действующему чемпиону и рекордсмену мира из России, и занял третье место в армейском рукопашном бое.

В многоборье Константин Макатревич (4 курс) стал серебряным призером в беге на 100 метров, а Владислав Ляховский (4 курс) занял второе место в командном зачете.

В рамках спартакиады состоялась научно-практическая конференция по актуальным вопросам физической подготовки военнослужащих. Начальник учебной части военного факультета Андрей Казимирович Лушневский выступил с докладом «Система подготовки специалистов физической подготовки военнослужащих в Республике Беларусь».

**Соб. инф.**

**НА ФОТО: курсант военного факультета М. Гребенчук, призер спартакиады.**

# Спартакиада – на старт!

В ГрГУ имени Янки Купалы стартовала круглогодичная спартакиада. Поднять флаг соревнований было доверено капитанам команд-победительниц прошлогодней университетской спартакиады: Максиму Гребенчуку (военный факультет), Юлии Тур (юридический факультет) и Александру Габрусевичу (факультет математики и информатики).

В торжественном открытии спартакиады участвовали команды четырнадцати факультетов Гродненского государственного университета имени Янки Купалы. Круглогодичная спартакиада ГрГУ будет проводиться по восьми видам спорта: баскетболу, волейболу, мини-футболу, легкой атлетике, настольному теннису, плаванию, шахматам, военной кроссовой эстафете.

Открывали спартакиаду соревнования по легкой атлетике, в программе которых – бег на 100 и 400 метров, толкание ядра, прыжки в высоту и длину, эстафета. По итогам соревнований первое место заняла команда юридического факультета, на втором месте – военного, на третьем – факультета математики и информатики.

Студенты ГрГУ примут участие в акциях и мероприятиях, посвященных XXX Олимпийским играм. С 1 по 15 декабря пройдет республиканская акция «Олимпизм и молодежь». Будут проведены конкурсы: «Олимпийцы среди нас», «Лучший олимпийский уголок «Беларусь спортивная», «Лучший олимпийский урок «О спорт! Ты – радость», конкурсы рисунков «Олимпиада Лондон-2012», «Олимпиада Сочи-2014», «Чемпионат мира по хоккею-2014 в Минске».

**К.И. АКУЛИЧ,**

**директор спортивного клуба.**


**УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**

**«ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ»**

**ФАКУЛЬТЕТ ПЕРЕПОДГОТОВКИ И ПОВЫШЕНИЯ КВАЛИФИКАЦИИ КАДРОВ «ШКОЛА ТУРИЗМА И ГОСТЕПРИИМСТВА»**

**приглашает на ПЕРЕПОДГОТОВКУ**

**лиц с высшим образованием и студентов старших курсов очной формы обучения**

| Специальность | Квалификация | Срок обучения | Форма обучения |
|---|---|---|---|
| Менеджмент туристской индустрии | менеджер | 20 месяцев | заочная |
| Менеджмент туристской организации | менеджер | 20 месяцев | заочная |
| Туроператорская и турагентская деятельность | менеджер по формированию и продаже туристского продукта | 20 месяцев | заочная |
| Лингвистическое обеспечение туристского продукта | гид-переводчик | 20 месяцев | заочная |
| Социокультурное обеспечение туристской деятельности | культуролог-аниматор | 20 месяцев | заочная |
| Экономика и управление в предпринимательской деятельности | экономист-менеджер | 18 месяцев | заочная |
| Финансы и кредит в предпринимательской деятельности | экономист по финансам | 18 месяцев | заочная |
| Бухгалтерский учет и контроль в предпринимательской деятельности | бухгалтер-экономист | 18 месяцев | заочная |

**Совместно с УО «Могилевский государственный университет продовольствия»**

| Специальность | Квалификация | Срок обучения | Форма обучения |
|---|---|---|---|
| Технология хранения и переработки мяса и мясных продуктов | инженер-технолог | 22 месяца | заочная |
| Технология хранения и переработки молока и молочных продуктов | инженер-технолог | 22 месяца | заочная |
| Технология производств хлебопекарной, макаронной, кондитерской продукции и пищевых концентратов | инженер-технолог | 22 месяца | заочная |
| Технология химических волокон | инженер-технолог | 22 месяца | заочная |

**НАШЕ БИЗНЕС-ОБРАЗОВАНИЕ – ВАШ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЙ УСПЕХ!**

**К нам поступают без экзаменов! Гибкая система оплаты!**

**Наш адрес: г. Гродно, ул. Врублевского, 33, 2-й этаж, каб. 219.**

**☎ 43-54-73; 8-029-267-96-72 (МТС); информация на сайте ftg.grsu.by**

**E-mail: d4818@post.grsu.by**



Заснавальнік: УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы». Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1083 ад 21.01.2010.

Адрас рэдакцыі: вул. Ажэшкі, 22, пакой 208б, 230023, Гродна. Тэлефон 73-19-52. Рэдактар: Наталія Пятроўна ДУДКО.

Падпісана да друку: 24.10.2011 у 09.00. Аб'ём – 2 друк. арк. Тыраж 1000 экз. Заказ №6092. Друк: ГАУПП «Гродзенская друкарня», г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4